**ДЗМІТРАЧЭНКА Ігар Сямёнавіч.** Нарадзіўся 1 студзеня 1937 г. у г. Веліж Смаленскай вобласці (Расія) у сям'і служачых. Рускі. Скончыў педагагічны факультэт Беларускага інстытута фізічнай культуры па спецыяльнасці "Фізічная культура" з наданнем кваліфікацыі "Выкладчык фізічнай культуры" (1959). Вучонае званне дацэнта нададзена ў 1993 г. Працаваў трэнерам Брэсцкага райсавета "Лакаматыў" (1959–1965). З 1965 г. асістэнт, старшы выкладчык, з 1993 г. дацэнт кафедры фізічнага выхавання Брэсцкага педінстытута. У 1981–1998 гг. быў загадчыкам згаданай кафедры. У 1988 г. выконваў абавязкі намесніка дэкана фізіка-матэматычнага факультэта БрДПІ. Майстар спорту СССР па лёгкай атлетыцы (1963). Чэмпіён Еўропы 1960 г., 1963 г., чэмпіён БССР 1959–1960 гг. сярод бегуноў на 400 м. Суддзя вышэйшай нацыянальнай катэгорыі. Узнагароджаны юбілейным медалём ЦС СДСА "Буравеснік" "За актыўную працу" (1965), нагрудным знакам "Выдатнік фізічнай культуры" (1968), медалём "Ветэран працы" (1983). Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь (1995). Сфера навуковых зацікаўленняў – праблемы фізкультурна-аздараўленчай работы сярод навучэнскай моладзі, тэорыя і методыка фізвыхавання, спартыўнай трэніроўкі і аздараўленчай фізічнай культуры. Аўтар больш за 40 навуковых, вучэбна-метадычных і навукова-папулярных публікацый.